# СВЯТА САВЕЦКАЙ ДЭМАКРАТЫІ

**У нядзелю, 12 сакавіка, гасцінна адкрыюцца дзверы выбарчых участкаў. Выбары ў Вярхоўны Савет БССР і мясцовыя органы ўлады ў нашай рэспубліцы праводзяцца ў знамянальны час, калі ўся краіна і прагрэсіўнае чалавецтва рыхтуецца ўрачыста адзначыць 50-годдзе існавання першай у свеце сацыялістычнай дзяржавы. Яны стануць сведкай яшчэ аднаго яскравага доказу непераможнасці і велізарнай творчай дзейнасці дэмакратыі працоўных.**

**Разам з усім савецкім народам маналітнае адзінства, згуртаванасць вакол слаўнай ленінскай партыі прадэманструе калектыў нашага універсітэта. На яго сцягу цяпер ззяе ордэн—адзнака поспехаў у навуковых даследаваннях, выхаванні моладзі і падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў для народнай гаспадаркі і шматлікіх галін культуры. Размешчаныя ў яго светлых і прыгожых карпусах выбарчыя ўчасткі прыгожа аформлены, у іх створаны ўсе ўмовы для таго, каб кожны змог добрасумленна выканаць свой грамадскі абавязак і культурна адпачыць.**

**Кожны член нашага ардэнаноснага калектыва, пачынаючы ад студэнта-першакурсніка і заканчваючы акадэмікам, добра ўсведамляе сабе, што ў нядзелю ён будзе галасаваць за далейшы росквіт любімай бацькаўшчыны, развіццё сацыялістычнай дэмакратыі, пашырэнне ўмоў для плённай працы ў імя свабоды і шчасця усіх працоўных.**

**Адзін дзень аддзяляе нас ад вялікага свята савецкай дэмакратыі. Мы заклікаем усіх студэнтаў, выкладчыкаў, прафесараў, рабочых і служачых універсітэта ў час выбараў аддаць свае галасы за кандыдатаў блока камуністаў і беспартыйных, праявіць высокую арганізаванасць і адданасць партыі і Радзіме, ідэалам камунізма.**


**Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!**

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 9 (659) Пятніца, 10 сакавіка 1967 года. Год выд. XX. Цана 2 кап.


*НАШЫ КАНДЫДАТЫ*

## ШЧАСЦЁ—У ТВОРЧАЙ ПРАЦЫ

Кандыдатам у дэпутаты Ленінскага раённага Савета дэпутатаў горада Мінска па Першай выбарчай акрузе вылучана партніха вытворчага камбіната тэатра оперы і балета Соф'я Яўгеньеўна Ліпчак. У васемнаццаць год пачалася яе працоўная дзейнасць, якую неўзабаве перарвала вайна. Разам са сваімі сяброўкамі з Разанскай вобласці дзяўчына ідзе на фронт і мужна змагаецца за свабоду і незалежнасць Радзімы. Потым—актыўны ўдзел у аднаўленні народнай гаспадаркі. Амаль дзесяць год Соф'я Яўгеньеўна працуе партніхай у камбінаце. За старанне ў працы, добрасумленнасць гэтую жанчыну вельмі паважаюць у калектыве. Яна заўсёды перавыконвае заданні і дабіваецца выдатнай якасці прадукцыі. Член фабкома камбіната, член рэдкалегіі насценнай газеты — гэтыя і многія іншыя даручэнні партыйнай і прафсаюзнай арганізацыі яна выконвае з вялікай грамадзянскай адказнасцю. Творчай працай, шчырымі клапатлівымі адносінамі да людзей Соф'я Яўгеньеўна заваявала права быць прадстаўніком народа ў мясцовых органах улады.

**В**ЕЧАРАМ, трэцяга сакавіка, перапоўнена была тэатральная зала Акруговага Дома афіцэраў. Сюды, на сустрэчу са сваім кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР кандыдатам у члены Палітбюро ЦК КПСС, першым сакратаром Цэнтральнага камітэта Кампартыі Беларусі Пятром Міронавічам Машэравым прыйшлі выбаршчыкі Ленінскай выбарчай акругі горада Мінска—рабочыя, інжынерна-тэхнічныя работнікі і служачыя прамысловых прадпрыемстваў і будоўляў, прадстаўнікі калектываў устаноў, дзеячы літаратуры і мастацтва, выкладчыкі і студэнты. Прысутныя цёпла сустрэлі з'яўленне ў прэзідыуме П. М. Машэрава. З вялікім уздымам быў выбраны ганаровы прэзідыум у саставе Палітбюро ЦК КПСС.

Першым слова атрымлівае даверaная асоба—загадчык кафедры гісторыі КПСС Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаў-

## СЛУЖЭННЕ РАДЗІМЕ— ВЫШЭЙШАЯ МЭТА

нага універсітэта імя У. І. Леніна доктар філасофскіх навук У. М. Сікорскі. Усевалад Міхайлавіч у сваім выступленні адзначыў, што гэтая выбарчая кампанія праходзіць у знамянальны час падрыхтоўкі савецкіх людзей, а разам з імі і працоўных усіх краін да слаўнага 50-годдзя Вялікага Кастрычніка. Шматтысячны калектыў універсітэта назваў сваім кандыдатам ў дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР кандыдата ў члены Палітбюро ЦК КПСС, першага сакратара ЦК КПБ Пятра Міронавіча Машэрава. Імя гэтага чалавека добра вядома працоўным нашай рэспублікі. За дваццаць восем год свайго працоўнага жыцця ён прайшоў шлях ад сельскага настаўніка да вядомага партыйнага і дзяржаўнага дзеяча. За праяўленыя мужнасць і бясстрашша ў барацьбе з фашысцкімі захопнікамі ён удастоен высокага звання Героя Савецкага Саюза.

Падрабязна ахарактарызаваўшы жыццёвы шлях П. М. Машэрава, таварыш У. М. Сікорскі у заключэнне сваёй прамовы заклікаў выбаршчыкаў акругі ў дзень выбараў аднадушна прагаласаваць за кандыдатаў блоку камуністаў і беспартыйных.

Цёпла было сустрэта выступленне слесара-лякальшчыка станкабудаўнічага завода імя Кастрычніцкай рэвалюцыі Героя Сацыялістычнай працы М. А. Каменскіх. Калектыў гэтага завода таксама назваў сваім кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР Пятра Міронавіча Машэрава. Галоўны тэхнолаг станкабудаўнічага завода імя Кірава М. П. Клімаў, вядомы беларускі пісьменнік Максім Лужанін, студэнтка педагагічнага інстытута імя Горкага Вольга Паўлоўская ад імя сваіх калектываў з вялікай аднадушнасцю падтрымалі кандыдатуру Пятра Міронавіча Машэрава ў кандыдаты Вярхоўнага Савета БССР, заклікалі ўсіх выбаршчыкаў аддаць свае галасы за вернага сына беларускага народа, нашага дастойнага абранніка.

Затым цёпла сустрэты выбаршчыкамі з вялікай прамовай выступіў кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР Пётр Міронавіч Машэраў. Яго прамова была выслухана з вялікай увагай і неаднаразова перапынялася апладысментамі.



**Для паслуг выбаршчыкаў заўсёды гасцінна адчынены дзверы агітпункта № 13. Партыйнае бюро філфака (сакратар С. А. Гусак) шмат старання прыкладвае для таго, каб наведвальнікі заўсёды змаглі прачытаць тут самыя розныя часопісы, брашуры, газеты.**

## ПОЧЫРК КАМУНІСТА

Дастойным прадстаўніком у дэпутаты Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных з'яўляецца Міхаіл Іванавіч Гайдук — токар механічнага цэха станкабудаўнічага завода імя Кірава. За час працы на гэтым прадпрыемстве праявіў сябе высокакваліфікаваным спецыялістам. За выдатныя паказчыкі ў працы, вялікую выхаваўчую работу сярод калектыва ўдастоен высокага звання ўдарніка камуністычнай працы.

Міхаіл Іванавіч нарадзіўся ў 1934 годзе ў вёсцы Стаўніцы, Асіповіцкага раёна, Магілёўскай вобласці, у сям'і калгасніка, беларус, член КПСС.

Міхаіл Іванавіч прымае актыўны ўдзел у грамадскім жыцці завода, добрасумленна адносіцца да вытворчых даручэнняў, выконвае іх з вялікім стараннем і шчырасцю. Таварыш Гайдук аказвае старанную дапамогу маладым рабочым, перадае ім свой багаты вопыт. Сярод калектыва станкабудаўнікоў карыстаецца вялікай павагай і аўтарытэтам.

## ІМ ГАНАРАЦЦА СТАНКАБУДАЎНІКІ

З 1945 года пачынаецца працоўная біяграфія Івана Іванавіча Капачэўскага, з таго часу ён заўсёды знаходзіўся і знаходзіцца на правым флангу рабочага калектыва станкабудаўнічага завода імя Кірава.

Іван Іванавіч нарадзіўся ў сялянскай сям'і ў 1927 годзе на Міншчыне. Ужо ў 17 год ён ідзе на працу, спачатку супрацоўнікам упраўлення міліцыі горада Мінска, а з 1954 года і па сённяшні дзень таварыш Капачэўскі — токар. За сваю прынцыповасць ён заваяваў любоў усяго калектыва завода.

І. І. Капачэўскі з'яўляецца дастойным кандыдатам у дэпутаты Мінскага гарадскога Савета.

## НА ГАЛОЎНЫМ НАПРАМКУ

*З вялікім натхненнем савецкія людзі выконваюць заданні пяцігодкі. У першых шарэнгах ідуць члены брыгад і ўдарнікі камуністычнай працы. Сярод іх нямала людзей, якія ўдастоены права быць выбранымі ў органы народнай улады. Яго заваяваў таксама шафёр аўтагаспадаркі Міхаіл Фёдаравіч Кавалёў. Яму сорак год, нарадзіўся Міхаіл Фёдаравіч у пасёлку Асінаўка Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці.*

*М. Ф. Кавалёў вельмі рана пачаў сваю працоўную дзейнасць у калгасе імя Леніна ў сваім жа раёне. Затым служыў у Савецкай Арміі, а пасля дэмабілізацыі быў прыняты слесарам на Мінскі аўтарамонтны завод. Праз год юнаку даручаюць адказную працу ў аўтагаспадарцы. Тут ён хутка праявіў сябе вопытным работнікам, аўтарытэтным таварышам. У калектыве М. Ф. Кавалёва любяць за тое, што ён умее берагчы тэхніку і іншую дзяржаўную маёмасць, заўсёды прыходзіць на дапамогу тым, хто ў гэтым мае патрэбу. За актыўны ўдзел у грамадскім жыцці, поспехі ў вытворчай працы Міхаіл Фёдаравіч мае шмат грамат і падзяк, ён добрасумленна выконвае абавязкі дэпутата Ленінскага раённага Савета дэпутатаў працоўных, а цяпер зноў вылучан кандыдатам у дэпутаты.*

## ВОПЫТНЫ АРГАНІЗАТАР

**Вопытны арганізатар, заслужаны ўрач Беларусі... Гэтага ганаровага звання ў нашай рэспубліцы ўдастойваюцца тыя медыцынскія работнікі, якія асабліва праявілі сябе ў барацьбе за здароўе працоўных, самаадданa выконваюць свае абавязкі. Да такіх людзей адносіцца і загадчык аддзела аховы здароўя Ленінскага раёна Дар'я Фёдараўна Скарапанава. Яна нарадзілася ў 1915 годзе ў вёсцы Фалілеева Валакаламскага раёна Маскоўскай вобласці. Руская, адукацыя вышэйшая, член Камуністычнай партыі з 1942 года.**

**Дар'я Фёдараўна працуе ў сістэме аховы здароўя амаль дваццаць пяць год. За гэты час шмат добрага зроблена для людзей, пройдзен вялікі шлях ад радавога ўрача да вядомага ў нашым горадзе арганізатара медыцынскага абслугоўвання. Пад яе кіраўніцтвам большасць медыцынскіх устаноў Ленінскага раёна значна палепшыла сваю работу, актыўна змагаецца за здароўе насельніцтва. Д. Ф. Скарапанава—удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, яна была на Ленінградскім і Волхаўскім франтах. За праяўленую мужнасць і адвагу ўдастоена ўрадавых узнагарод. У 1966 годзе за заслугі ў галіне развіцця аховы здароўя ў рэспубліцы ёй прысвоена ганаровае званне «Заслужаны ўрач БССР». Дар'я Фёдараўна актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці сталіцы, яна з'яўляецца сакратаром партыйнай арганізацыі, добрасумленна выконвае ўсе даручэнні райвыканкома. Яна вылучана кандыдатам у дэпутаты Ленінскага раённага Савета.**

# 12 САКАВІКА—ВЫБАРЫ

**АДНАДУШНА АДДАДЗІМ СВАЕ ГАЛАСЫ ЗА КАНДЫДАТАЎ БЛОКУ КАМУНІСТАЎ І БЕСПАРТЫЙНЫХ!**

ЮБІЛЕЮ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

# ПЕРШАЯ ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ

За апошнія гады наш універсітэт значна вырас — пабудаваны новыя карпусы, павялічылася колькасць студэнтаў і выкладчыкаў, паявілася вялікая армія інжынераў, якія працуюць у праблемных лабараторыях і вылічальным цэнтры, значна папоўніўся штат абслугоўваючага персаналу. Колькасць супрацоўнікаў у цяперашні час перавышае паўтары тысячы. Інжынерна-выкладчыцкі калектыў папаўняецца ў асноўным за кошт выпускнікоў універсітэта, многія з якіх займаліся ў спартыўных секцыях, абаранялі і абараняюць спартыўны гонар нашай альма-матэр. Многія з іх паспяхова працягваюць удасканальваць сваё майстэрства і ў цяперашні час. Ад спаборніцтваў да спаборніцтваў павышаюць свае вынікі майстар спорту міжнароднага класа па лёгкай атлетыцы старшы лабарант гістфака А. Котаў, майстар спорту па мастацкай гімнастыцы аспірантка біяфака Л. Літвінава, майстар спорту па класічнай барацьбе старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання А. Фефелаў, кандыдаты ў майстры па шашках інжынер вылічальнага цэнтра Г. Драбушэвіч, выкладчык хімфака Н. Рафальскі і многія іншыя. У цяперашні час ва універсітэце працуе дваццаць адзін майстар і кандыдат у майстры спорту і больш шасцідзесяці першаразраднікаў.

З ростам колькасці моладзі ўпаўне зразумела і апраўдана вялікая цяга да спорту, фізічнага ўдасканалення супрацоўнікаў БДУ малодшага пакалення і падтрымання здароўя ў людзей пажылога ўзросту. Пагэтаму вялікай цікавасцю ва універсітэце карыстаюцца секцыі супрацоўнікаў па валейболу, баскетболу, настольнаму тэнісу і рыбалоўнаму спорту. Рэгулярна праводзяцца лыжныя прагулкі і турысцкія паходы. Для супрацоўнікаў, якія маюць некаторыя слабасці здароўя, створана група выздараўленчай фізкультуры «Здароўе».

Рост колькасці супрацоўнікаў запатрабаваў карэнным чынам змяніць масавую работу. Калі ў мінулыя гады спаборніцтвы праводзіліся эпізадычна, то ў цяперашнім навучальным годзе мясцкомам універсітэта прынята рашэнне аб рэгулярным правядзенні спаборніцтваў і аб'яднанні іх у зімовую і летнюю спартакіяды з комплексам залікаў.

Нядаўна была праведзена Першая зімовая спартакіяда, прысвечаная 50-годдзю Савецкай дзяржавы. У праграму спартакіяды ўваходзілі спаборніцтвы па васьмі відах спорту: валейболу, баскетболу, настольнаму тэнісу, стральбе, лыжах, шахматах, шашках і спартыўнаму рыбалоўству. Перад спаборніцтвамі ставілася задача шырокага ахопу навуковых супрацоўнікаў і абслугоўваючага персаналу ў рэгулярных занятках спортам і арганізацыі актыўнага адпачынку супрацоўнікаў. У паядынках прыняло ўдзел 308 чалавек — прадстаўнікоў ад 11 прафсаюзных груп. Але поўныя саставы каманд па ўсіх відах спорту выставілі толькі фізічны, матэматычны, хімічны факультэты і вылічальны цэнтр, паміж якімі і вялася барацьба за хрустальны кубак пераможцы.



*На здымку: пераходны кубак і ганаровыя граматы мясцкома атрымаў прадстаўнік фізфака інжынер П. І. Зайцаў.*

Найбольш паспяхова выступаў фізічны факультэт, які заняў першыя месцы па валейболу сярод мужчынскіх каманд, баскетболу, стральбе, лыжах і другія месцы па шахматах, шашках і рыбалоўнаму спорту. Другое месца ў спартакіядзе дасталося матэматычнаму факультэту, які заняў першыя месцы па валейболу сярод жаночых каманд, шахматах і рыбалоўнаму спорту. Трэцяе месца заняў біялагічны факультэт. Яму належыць першае месца па настольнаму тэнісу.

Вялікую цікавасць у гледачоў выклікалі паядынкі спартыўных гульняў. У спаборніцтвах па валейболу прыняла ўдзел рэкордная колькасць супрацоўнікаў — 72, восем мужчынскіх і тры жаночыя каманды. Па сваёй колькасці і спартыўна-тэхнічнай падрыхтаванасці спартыўныя баі мала чым уступалі тым, якія былі на першынстве універсітта, хаця тут удзельнічалі толькі супрацоўнікі і аспіранты. Пераможцамі сталі ў мужчын каманда фізфака, за якую выступалі першаразраднікі А. Гусакоў, У. Гаўрон, А. Ільюшчанка; у жанчын перамогу атрымала каманда матфака.

Па баскетболу ўдзельнічала шэсць каманд. На першую ступеньку першынства зноў сталі фізікі, у камандзе якой мы ўбачылі членаў зборнай універсітэта: першаразраднікаў А. Сокальскага, які выдзяляўся сярод іншых сваім двухмятровым ростам, С. Чэранкевіча, В. Ткачэнка і У. Гаўрона.

Чэмпіёнамі спартакіяды па настольнаму тэнісу ў мужчын сталі старшы інжынер хімфака А. Ціханаў і інжынер вылічальнага цэнтра Л. Рута (у жанчын).

Па стралковаму спорту найбольш ачкоў (93) набралі старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання В. Кушнароў і лабарантка фізфака Б. Пляскач, якая змагла абыйсці ўсіх мужчын у стральбе з пісталета з вынікам 89 ачкоў.

Чэмпіёнам па шахматах стаў старшы выкладчык матфака Я. Наумовіч, па шашках — інжынер вылічальнага цэнтра Г. Драбушэвіч.

Лыжныя спаборніцтвы праводзіліся ў раёне Зялёнага луга. Тры кіламетры ў жанчын з вялікай перавагай выйграла аспірантка хімфака Н. Глухава з вынікам 13,04; перамога на пяцікіламетровай дыстанцыі ў мужчын дасталася аспіранту фізфака А. Кузнечыку. Яго час — 22,13. І нарэшце, у спаборніцтвах па падлёднаму лову, які праводзіўся на Мінскім моры, адзначыўся сваім майстэрствам лабарант біяфака В. Цішук, які, нягледзячы на дрэнны клёў, «умудрыўся» налавіць 1 кілаграм 700 грамаў яршоў. Выкладчыку ж матфака І. Сокалаву пашанцава больш за ўсіх. Ён злавіў самую вялікую рыбу — окуня вагою ў 400 грамаў.

Першая зімовая спартакіяда супрацоўнікаў закончана. Зараз можна адказаць скептыкам: сярод супрацоўнікаў універсітэта можна весці спартыўную работу.

Да новых сустрэч на спартыўных пляцоўках летняй спартакіяды!

**В. ХРЭНАЎ,**
**галоўны суддзя спартакіяды, старшы выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту.**

**Неўзабаве пачнецца лета. Для баскетбалістак нашага універсітэта яно прынясе ўпартыя спартыўныя паядынкі, традыцыйныя паездкі ў рэспублікі Прыбалтыкі, дзе яны будуць абараняць спартыўны гонар БДУ. А пакуль — настойлівыя і старанныя трэніроўкі ў спартыўнай зале.**



**ТАБЛІЦА СПАРТЫЎНЫХ ВЫНІКАЎ ПЕРШАЙ ЗІМОВАЙ СПАРТАКІЯДЫ СУПРАЦОЎНІКАЎ**

| Прафбюро факультэтаў і арганізацый. | Валейбол | | Баскетбол | Настольны тэніс | Стральба | Лыжы | Шахматы | Шашкі | Рыбалоўны спорт | Агульная колькасць ачкоў | Агульнае месца |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | муж. | жан. | | | | | | | | | |
| 1. Фізфак | 1 | — | 1 | 3 | 1 | 1 | 2 | 2 | 2 | 13 | I |
| 2. Матфак | 5 | 1 | 2 | 6 | 3 | 5 | 1 | 3 | 1 | 22 | II |
| 3. Біяфак | 4 | 2 | 6 | 1 | 2 | 4 | 5 | 6—7 | 3 | 29,5 | III |
| 4. Вылічальны цэнтр | 8 | 3 | — | 2 | 7 | 3 | 3 | 1 | — | 34,4 | IV |
| 5. Хімфак | 7 | — | 5 | 4 | 5 | 2 | — | 4 | — | 42,5 | V |
| 6. Гістфак | 2 | — | 4 | 5 | 6 | 8 | 4 | 6—7 | — | 43,5 | VI |
| 7. Кафедра фізвыхавання | 6 | — | 3 | — | 4 | — | 6 | 5 | 5 | 45 | VII |
| 8. Юрфак | 3 | — | — | — | — | — | — | — | 4 | 53 | VIII |
| 9. Геолага-геаграфічны | — | — | — | — | — | 6 | — | — | 6 | 58 | IX |
| 10. Філфак | — | — | — | — | — | 7 | — | — | — | 61 | X |
| 11. Адміністрацыйная частка | — | — | — | — | — | — | — | — | 7 | 62 | XI |

**Заўвагі:** 1. У залік па валейболу ішла мужчынская або жаночая каманда. 2. Для падвядзення агульнага месца факультэту, які не выставіў каманду у асобным відзе спорту, бралася пад увагу апошняе месца плюс адно штрафкое ачко.

# ЁСЦЬ ТАКАЯ НАВУКА—ЧЫТАЦЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 3 стар.).*

перажываць тое, што іх хвалюе.

Вучоныя напісалі нямала кніг, прысвечаных гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. У гэтых кнігах многа фактычнага матэрыялу, лічбаў, працэнтаў і г. д. Пісьменнік Канстанцін Сіманаў таксама шмат сваіх твораў прысвяціў вайне, але пра гераічныя падзеі ён расказвае не мовай лічбаў, а праз успрыманне сваіх герояў — Сінцова, Сярпіліна і іншых. Мастак на індывідуальных лёсах герояў паказвае характэрныя, тыповыя для цэлага пакалення рысы, праз перажыванні і думкі персанажаў расказвае аб сутнасці гістарычных зрухаў і змен.

Літартурны твор — адзінае цэлае. Усе часткі яго цесна звязаны адна з адной. Усе дэталі нясуць пэўную сэнсавую нагрузку, выконваюць пэўную ролю. Але ці ўмеюць усе правільна чытаць мастацкі твор?

Часта маладыя людзі «глытаюць» вялікі раман за адзін вечар. Яны сочаць толькі за інтрыгай, за сюжэтнай канвой, а ўсё астатняе прапускаюць. Там, дзе для чытача з развітым мастацкім густам нават у невялікім урыўку адкрываецца пэўны малюнак жыцця, іншы «кнігаглытальнік» не заўважыць нічога цікавага.

Пейзаж, інтэр'ер, унутраны свет героя, мова — усё гэта ў сапраўдным мастацкім творы дапамагае лепшаму раскрыццю задумы аўтара. Прапускаць гэтыя, на першы погляд, дробязныя дэталі — значыць, не ўмець чытаць.

На самай справе пейзаж вызначае атмасферу дзеяння, адцяняе перажыванні і пачуцці герояў. Вельмі часта пейзаж прымушае задумацца над вялікімі жыццёвымі праблемамі. Успомніце апошні раздзел першай часткі «Мёртвых душ»: «Русь! Русь! Бачу цябе, з маёй цудоўнай, дзівоснай далечыні цябе бачу...»

Важны ў агульнай мастацкай канве твора і інтэр'ер, хаця ён займае больш сціплае месца ў параўнанні з пейзажам. Інтэр'ер, як і пейзаж, цікавіць пісьменніка не сам па сабе. Апісанне абстаноўкі дапамагае больш поўна ахарактарызаваць героя, глыбей раскрыць яго ўнутраны змест, прывычкі, сімпатыі, густы і г. д.

Вялікую ролю ў раскрыцці ўнутранага зместу персанажаў мае партрэт. І ў вялікім рамане, і ў кароткім апавяданні мы заўсёды сустракаем партрэты, намаляваныя літаральна некалькімі штрыхамі.

У апавяданні А. П. Чэхава «Чалавек у футляры» мы чытаем, што з-за парасона і шапкі, з-за паднятага каўняра паліто, якое Белікаў апранаў нават у добрае надвор'е, бачны цёмныя акуляры і маленькі белы твар, «ведаеце, ...як у тхарка». Гэта параўнанне стварае не толькі знешні партрэт героя, але і характарызуе яго ўнутраны змест. Схаваўшыся ў футляр, ён пастаянна ўмешваецца ў жыццё іншых людзей, тэрарызуе іх, атручвае ім існаванне.

Пейзаж, інтэр'ер, знешняя характарыстыка вобразаў— усё гэта важна, але гэта яшчэ не ўсё. У майстэрстве псіхалагічнага аналізу важныя найтанчэйшыя адценні, штрыхі, дробныя дэталі. Але для таго, каб чытач бачыў і адчуваў героя гэтак жа, як і аўтар, мала аднаго толькі пісьменніцкага ўмення і таленту. Патрэбен яшчэ і талент чытача, патрэбна яго ўменне чытаць.

Уважлівы чытач часам па кароткаму дыялогу персанажаў твора, у якім рэмаркі аўтара зведзены да мінімуму, атрымлівае дакладнае ўяўленне аб кожным з герояў. У творы, напісаным самай звычайнай мовай, такі чытач прачытае больш, чым напісана, пачуе ў словах героя не толькі тое, што ён хацеў сказаць, але і тое, што сказаў аўтар, аб'ектыўна, незалежна ад свайго суб'ектыўнага намеру.

Ці варта перачытваць адзін і той жа мастацкі твор некалькі разоў? Адны кажуць: не трэба, адно і тое ж, маўляў.

Мне ўспамінаецца мая школьная настаўніца Серафіма Мікалеўна Чарнышова. Улюбёная ў літаратуру, яна гаварыла, што творы Л. Талстога трэба чытаць не менш трох разоў у жыцці— у маладосці, у сталыя гады і пад старасць. І кожны раз у адных і тых жа творах можна знайсці шмат новага: і таленавіта выпісаныя малюнкі роднай прыроды, і новыя думкі, і філасофскія абагульненні, якіх раней чамусьці не заўважаў.

Тое ж самае датычыць і іншых нашых карыфеяў літаратуры.

Такім чынам, талент патрэбен не толькі пісьменніку, але і чытачу. Аб гэтым вельмі добра сказаў паэт Яўген Вінакураў: «Чуласць, здольнасць тонка ўспрымаць — вось талент чытача. Не кожны чалавек валодае ў патрэбнай ступені гэтым талентам. А той, хто ім валодае, павінен развіваць і берагчы яго».

Дададзім: і дапамагаць абуджаць гэты талент у іншых.

М. С. ЗЯРНІЦКІ,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт.

**рэдактар М. І. ЮСЬКА.**

АТ 17272 **Адрас рэдакцыі: Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, І паверх, п. 106, тэл. Б-2-07-19, Друкарня выдавецтва «Звязда».** Зак. № 563.